УДК: 61:615.1(043.2)
ББК: 5:52.8
ISBN: 978-985-21-0532-3



***Хаціменка Г. А., Саўчанка А. С.***

**ЛЯЧЭННЕ ПРАСТУДНЫХ ЗАХВОРВАННЯЎ З ДАПАМОГАЙ ЛЕКАВЫХ ТРАЎ І НАРОДНЫХ СРОДКАЎ**

***Навуковы кіраўнік ст. выкл. Носік А.А.***
*Кафедра беларускай і рускай моў*
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, г. Мінск*

Дадзеная тэма даўно выклікала цікавасць як сярод медыцынскай аўдыторыі, так і сярод асоб, якія не маюць непасрэднага дачынення да навуковай медыцыны. Яна вельмі актуальная і ў наш час. Асабліва важнымі бачацца пытанні наконт таго, як адрозніць грып ад прастуды і як зберагчы сябе ад гэтых хвароб.

З гэтай прычыны мэтай работы стала выяўленне найбольш эфектыўных спосабаў барацьбы з прастуднымі захворваннямі з дапамогай лекавых траў і народных сродкаў, а таксама метадаў прафілактыкі.

Задачы:

1. Сабраць інфармацыю аб прастудных захворваннях і грыпе.
2. Даведацца аб значэнні лекавых траў і іх выкарыстанні пры прастудных захворваннях.
3. Вывучыць вядомыя рэцэпты народнай медыцыны.

З навуковых крыніц была атрымана інфармацыя наконт адрознення грыпу ад прастуды. Пры анкетаванні высветлена, як часта хварэюць студэнты ў нашай групе. Падчас наведвання музея народнай медыцыны «Дом траўніка» стала вядома шмат рэцэптаў, якія дапамагаюць пры прастудных захворваннях. Усе сабраныя рэцэпты аформлены ў выглядзе памяткі «Беражы сябе ад прастуды».

Лекавыя расліны і народныя сродкі дапамагаюць забяспечыць прафілактыку і лячэнне прастудных захворванняў. Лячыць прастуду можна з дапамогай энергіі гуку, кропкавага масажу, банечнага масажу, а таксама методыкі лячэння смехам.

Репозиторий БГМУ